Мінскі метрапалітэн

27 февраля 2017 года Министерство связи и информатизации Республики Беларусь выпускает в обращение две почтовые марки из серии «Минский метрополитен».

Продолжение серии. Начало — марки № 591, 592. Дизайн Елены Медведь. Печать офсетная, полноцветная. Бумага мелованная, гуммированная. Зуб. греб. 13: 131/2. Размер марок 52х29,6 мм. Номинал каждой марки — М. В листах по восемь марок и одному купону. Размер листов 172х108 мм. Тираж марок по 64 тыс.

Маркі друкаваліся ў РУП «Бабруйская ўзбуйненая друкарня ім. А. Т. Непагодзіна ».

Станцыя «Маскоўская» адкрыта ў 1984 г., 30 чэрвеня якога і пачаўся рэгулярны рух цягнікоў Мінскага метрапалітэна на першай лініі ад станцыі «Інстытут Культуры» да станцыі «Маскоўская» працягласцю 7,84 км з васьмю станцыямі і электрадэпо «Маскоўскае». Архітэктары: Ю.Івахнішын Л.Кустова, Л.Пагарэлаў. Мастакі: В.Даўгала, В.Стэльмашонак.

Станцыя «Пятроўшчына» адкрыта ў 2012 г., калі ўведзены ў эксплуатацыю ўчастак прадаўжэння першай лініі метрапалітэна ад станцыі «Інстытут Культуры» да станцыі «Пятроўшчына» працягласцю 5,12 км з трыма станцыямі.
Архітэктары: В.Целяпнёў, Н.Нікалаевіч.

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з дзяржаўным прадпрыемствам «Мінскі метрапалітэн».

Намінал маркі «М» адпавядае тарыфу на перасылку міжнароднай простай паштовай карткі прыярытэтнай.

У дзень выпуску паштовых марак у абарачэнне ў аддзяленні паштовай сувязі № 1 Мінска (крама «Філатэлія», вул. Маскоўская, 16) будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

Прадстаўленыя выявы не адлюстроўваюць дакладныя тэхнічныя характарыстыкі праекта.
« № 06 (707) 2017/02/24 | Інфармацыйныя лісткі 2017 года | № 08 (709) 01.03.2017 »

Вы таксама можаце праглядзець гэты інфармацыйны лісток ў фармаце PDF або загрузіць сабе на кампутар Архіваваную версію дадзенага PDF-файла для наступнага яго прагляду ў рэжыме off-line.

Source URL: *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/27-02-2017-1696*